# «ЗДАРОЎ, МАРОЗНЫ, ЗВОНКІ ВЕЧАР!»

**Да 125-годдзя з дня нараджэння М.Багдановіча**



**Па гарызанталі: 1.** Першы твор Максіма Багдановіча, які быў надрукаваны беларускамоўнай газетай «Наша Ніва» ў 1907 годзе. **4.** «Вы за кім у пагоню спяшыце?//Дзе ... вашы йдуць і куды?». З верша паэта «Пагоня». **7.** «Здароў, марозны, звонкі вечар!//Здароў, скрыпучы, мяккі ... !». З верша М.Багдановіча «Зімой». **9.** Цыкл вершаў, якія паэт прысвяціў сваёй знаёмай, жыхарцы г. Яраслаўля Ганне Какуевай, якую ён кахаў. **11.** Спосаб друкавання. **15.** «Зорка ...». Опера, якую прысвяцілі М.Багдановічу кампазітар Ю.Семяняка і паэт А.Бачыла. **16.** «... чыстае красы». Кніга аб жыццёвым і творчым шляху М.Багдановіча, якая выйшла ў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 2011 годзе. **17.** Рэчхатняга ўжытку. **18.** «І толькі ... «Вераніка»,//На ліпе ўрэзаны ўкары». З верша паэта «Ізноў пабачыў я сялібы». **19.** Тое, што і прывід. **20.** Кветка, якая ў творах М.Багдановіча сімвалізуе прыгажосць Беларусі. **24.** Сухі снежань — сухая вясна, сухое ... (прыкм.). **25.** «Часам лінь ці ... успляснуцца,//І кругі шырока разыйдуцца». З верша «Ціхі вечар, знікнула спякота». **26.** Верш паэта; восьмая ступень гамы.

**Па вертыкалі: 1.** Малаазійская багіня, маці багоў. **2.** «Мушка — ... і камарык — насаты тварык». Паэма М.Багдановіча. **3.** Хросны бацька ў адносінах да бацькоў хросніка. **5.** Травянiстая расліна, са сцяблоў якой атрымліваюць валакно. 6. Жоўтачырвоная фарба. **8.** Музыкант, які грае на гітары. **10.** «Эх, мароз, эх, дзед жартлівы !//Ты — ... і штукар». З паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». **12.** Раздзел метэаралогіі. **13.** Інструмент для свідравання адтулін. **14.** Пасіўнасць, бяздзейнічанне (перан.). **20.** «Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,//Свой ... канчаю я ў манастырскіх мурах». З верша «Летапісец». **21.** Званне, звязанае з пачэсным становішчам. **22.** Мужчынская прычоска. **23.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца.

**Склаў Лявон Целеш,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. «Музыка». 4. Шляхі. 7. Снег. 9. «Мадонна». 11. Афсет. 15. Венера. 16. Пясняр. 17. Рэшата. 18. Надпіс. 19. Здань. 20. Васілёк. 24. Лета. 25. Акунь. 26. Актава.

**Па вертыкалі:** 1. Ма. 2. Зелянушка. 3. Кум. 5. Лён. 6. Хна. 8. Гітарыст. 10. Аматар. 12. Сіноптыка. 13. Свердзел. 14. Спаннё. 20. Век. 21. Сан. 22. Кок. 23. Ра.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.16 | 16.48 | 7.32 |
| Віцебск — | 9.13 | 16.30 | 7.17 |
| Магілёў — | 9.06 | 16.38 | 7.32 |
| Гомель — | 8.54 | 16.43 | 7.49 |
| Гродна — | 9.30 | 17.04 | 7.34 |
| Брэст — | 9.22 | 17.13 | 7.51 |

### Месяц

*Першая квадра 7.12—13.12.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Васіля, Георгія, Івана, Ільі, Мікалая, Пятра, Якаба.*
*К. Леакадзіі, Наталлі, Яўхіма.*



Фота Яўгена ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## ■ Прэм'еры

# ДЗЮЙМОВАЧКА ЗАГАВАРЫЛА ПА-БЕЛАРУСКУ

**У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа да навагодніх і калядных свят для маленькіх гледачоў падрыхтавалі прэм'еру.**

— Відовішчны спектакль «Прыгоды Дзюймовачкі» па казцы Андэрсана адбудзецца 17 снежня. Аўтар інсцэніроўкі — расійскі драматург Павел Ісайкін. Упэўнены, што ён нікога не пакіне абыякавым. Спадзяёмся, што спектакль прынясе задавальненне як дзецям, так і іх бацькам. І будзе цудоўная магчымасць прыемна правесці час усёй сям'ёй, — паведаміў «Звяздзе» **літаратурны рэдактар віцебскага тэатра Юрый ІВАНОЎСКІ.**

Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Міхась Краснабаеў, сцэнаграфія Святланы Макаранкі, музыка Руслана Стабdroўскага. У ролі Дзюймовачкі — маладая актрыса Ульяна Ацясава. Пасля казкі коласаўцы пакажуць яшчэ навагоднее прадстаўленне каля ёлкі з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
*pukshanski@zviazda.by*

## Даты | Падзеі | Людзі

**9 СНЕЖНЯ**

**1842** год — нарадзіўся Пётр Крапоткін, рускі анархіст, гісторык, географ. Доўгія гады ён жыў у Еўропе: спачатку — у Францыі, затым у Швейцарыі, Англіі. Тут ён выдаваў газеты, актыўна прымаў удзел у з'ездах еўрапейскіх анархістаў. Пасля рэвалюцыі 1917 года Крапоткін вярнуўся ў Расію. Ён адказаў адмовай на прапанову Керанскага стаць міністрам, адмовіўся і ад усіх прывілеяў. Пажылы анархіст Пётр Аляксеевіч Крапоткін пасяліўся ў Дзмітраве, дзе і памёр 8 лютага 1921 года.

**1895** год — нарадзілася Далорэс Ібарury, дзеяч міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, старшыня Камуністычнай партыі Іспаніі (з 1959 г.). «Калі дазволіць фашыстам працягваць злачынствы, якія яны здзяйсняюць у Іспаніі, агрэсіўны фашызм абрынецца і на іншыя народы Еўропы. Нам патрэбна дапамога, самалёты і гарматы для нашай барацьбы. Іспанскі народ лепш памрэ стоячы, чым будзе жыць на каленях», казала яна на мітынгу 3 верасня 1936 года. Ёй жа належыць і знакамітая фраза «No pasaran!» — «Яны не пройдуць!»

**1916** год — дзень нараджэння Кірка Дугласа (сапр. Ісер Даніелавіч Дземскі), амерыканскага акцёра і рэжысёра. Бацькі жылі ў Магілёўскай губерні, у Мінску, пазней пераехалі ў Амерыку. Там ён паступіў ва ўніверсітэт св. Лаўрэнція, а затым у Амерыканскую акадэмію драматычнага мастацтва. З 1941 года іграў у тэатры, а ў 30-гадовым узросце прыйшоў у кіно. Сярод вядомых фільмаў, у якіх зняўся Дуглас, асаблівы поспех мелі «Чэмпіён», «Сцежкі славы», «Спартак». Усяго ў яго акцёрскім багажы каля 80 роляў. А ў ліку работ Дугласа-рэжысёра такія карціны, як «Гультай» і «Атрад». У 1997 годзе Кірк Дуглас быў удастоены прэміі «Оскар».

**1946** год — 70 гадоў таму (9 снежня 1946-га — 20 жніўня 1947 года) у Нюрнбергу праходзіў судовы працэс над 23 эсэсаўскімі ўрачамі і вучонымі-медыкамі, якія абвінавачваліся ў ажыццяўленні медыцынскіх эксперыментаў над вязнямі нацысцкіх канцлагераў.

**1976** год — 40 гадоў таму заснаваны Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. На тэрыторыі музея (плошча 151 га) і вакол яе сфарміраваны ўнікальныя прыродныя і антрапагенныя ландшафты, якія дазваляюць у мініяцюры адлюстраваць прыроднае багацце Беларусі, маючца і археалагічныя помнікі. Канцэпцыя прадугледжвае падзел тэрыторыі музея на 6 сектараў, якія адпавядаюць шасці гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам Беларусі: Цэнтральная Беларусь, Падняпроўе, Паазер'е, Панямонне, Усходняе і Заходняе Палессе. Галоўная асаблівасць музея ў тым, што ўсе пабудовы арыгінальныя. У экспазіцыі 35 помнікаў народнай архітэктуры.



### Было сказана

**Пімен ПАНЧАНКА, народны паэт Беларусі:**
*«Хвала і слава могуць разлучыць,*
*А гора і бяда заўсёды зблізяць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сапраўдны кот нават з самага далёкага закутка дома чуе, як на кухні адкрываецца халадзільнік.**

Муж — жонцы:
— Калі ў наступны раз будзеш казаць, колькі табе гадоў, памятай, што паміж табой і старэйшым сынам павінна быць розніца хаця б у 9 месяцаў.

**У дзяўчат з інтэрната кандытарскай фабрыкі ў цукерачна-букетным перыядзе адносін з хлопцамі адсутнічае цукерачны перыяд.**

Муж і жонка разгадваюць сканворд. Муж чытае:
— Хатняя жывёла, якая любіць паесці, паспаць і пагуляць. Тры літары.
І перасцерагальна падносіць да твару жонкі кулак.

**Доктар, калі вы мяне вылечыце ад інтэрнэт-залежнасці, я дадам вас у сябры!**




Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.158. Індэкс 63850. Зак. № 4883.
Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12